*belorusko/Byelorussian*

## НАТАТКА ПРА ВЯЛЕНЬЕ

**Вяленье** малады, сучасны еўрапейскі горад, з мадэрновай архітэктурай, які адкрыты для росту міжкультурных кантактаў. Як рынкавае месца Вяленье ўпершыню згадваецца ў 13-м ст., як горад яно пачало свой рост пасля другой сусветнай вайны; 20-га верасня 1959 г. быў урачыста адкрыты яго новазбудаваны цэнтр. Сёння Вяленье таксама цэнтр абшчыны, якая змяшчае ў сабе 25 паселішчаў з насельніцтвам каля 33 тысяч чалавек, з якіх у горадзе жыве каля 25 тысяч. Горад з'яўляецца адным з найважнейшых гаспадарчых цэнтраў Славеніі, а таксама працоўным, адміністрацыйным і адукацыйным цэнтрам савінска-шалешкага рэгіёна. Апірышчам вяленскага гаспадарчага развіцця з'яўляюцца каменнавугальная і метала-апрацоўчая прамысловасць, энергетыка і спецыялізаваная прадукцыя; у апошні час таксама турызм. За гасціннасць і арганізаванасць Вяленье некалькі разоў было ўзнагароджана, як на дзяржаўным, так і міжнародным узроўні. Прырода ў горадзе (390 м над узр. м. – Цітаў рынак) і наваколлі бачная і даступная скрозь: у гарадскіх парках, лясах, каля азёр, на месцах для шпацыраў, на роверных і горных дарожках. Рытму гарадскога жыцця істотна спрыяюць сучасна абсталяваныя спартовыя аб'екты, дамы культуры, музеі, установы адукацыі і шматлікія таварыствы, клубы і крэатыўныя асобы. Вяленье вядомае сваімі шматлікімі спартовымі, рэкрэацыйнымі, турыстычнымі і культурнымі мерапрыемствамі. Гэта горад музыкі, танца, паэзіі, геніальных ідэяў. У гісторыю Вяленья запісана багата знакамітых імёнаў; адтуль паходзяць вядомыя эканамісты, навукоўцы, артысты, спартоўцы, палітыкі і інш. Вяленье багатае культурна-гістарычнымі помнікамі і прыроднымі славутасцямі, але ў першую чаргу падзеямі і людзмі, якія вас ветліва запрашаюць і з радасцю чакаюць. – *Сардэчна запрашаем у Вяленье, старыя і новыя сябры!*

© UVKF/Velenika/Leemeta